Эстонія

ШТО ВАМ ПАТРЭБНА ВЕДАЦЬ ПРА СІСТЭМУ EURODAC

BELARUSIAN

ЧАМУ Я АТРЫМАЎ ГЭТУЮ БРАШУРУ?

Вы атрымалі гэтую брашуру, таму што ўладам трэба зняць вашы біяметрычныя дадзеныя.

Біяметрычныя дадзеныя — гэта вашыя адбіткі пальцаў і фота.

Гэтыя дадзеныя разам з вашымі асабістымі дадзенымі і іншай адпаведнай інфармацыяй будуць перададзены ў базу дадзеных Eurodac.

У брашуры тлумачыцца, якія ў вас правы падчас гэтага працэсу і што ад вас чакаецца.

ШТО ТАКОЕ СІСТЭМА EURODAC?

Eurodac — гэта еўрапейская база дадзеных, якая захоўвае і спалучае інфармацыю аб асобах, якія ўязджаюць у краіны ЕС+ і падпадаюць пад пэўныя катэгорыі. Гэтыя катэгорыі больш падрабязна апісаны ў брашуры.

Гэтая база дадзеных выкарыстоўваецца 31 краінай ЕС+, якія могуць апрацоўваць і атрымліваць вашыя дадзеныя. Калі вы без дазволу трапляеце ў іншую краіну ЕС+ і вашыя дадзеныя будуць узяты зноў, улады гэтай краіны ўбачаць усе дадзеныя пра вас, якія захоўваюцца ў сістэме Eurodac. У нейкіх выпадках вашыя дадзеныя будуць абноўлены новай інфармацыяй.

ШТО ТАКОЕ КРАІНЫ ЕС+?

Зараз вы знаходзіцеся ў Эстоніі, якая з'яўляецца краінай ЕС+.
Краіны ЕС+ гэта:

27 дзяржаў-членаў Еўрапейскага Саюза (ЕС): Аўстрыя, Бельгія, Балгарыя, Харватыя, Эстонія, Іспанія, Харватыя, Ірландыя, Італія, Грэцыя, Кіпр, Літва, Люксембург, Латвія, Нідэрланды, Мальта, Польшча, Партугалія, Францыя, Румынія, Славакія, Славенія, Швецыя, Германія, Фінляндыя, Данія, Чэхія, Венгрыя і

яшчэ 4 краіны: Ісландыя, Ліхтэнштэйн, Нарвегія і Швейцарыя.

ЯКАЯ МЭТА Ў СІСТЭМЫ EURODAC?

Сістэма Eurodac мае пяць асноўных мэтаў:

- дапамагаць краінам ЕС+ вызначаць, якая краіна адказвае за разгляд заявы аб міжнароднай абароне;
- дапамагаць у маніторынгу легальнай і нелегальнай міграцыі ў краіны ЕС+;
- абменьвацца інфармацыяй паміж нацыянальнымі органамі ўлады і прадухіляць злачыннасць і тэрарызм;
- забяспечваць кантроль і абарону дзяцей, якія прыбываюць у Еўропу;
- забяспечваць належнае функцыянаванне іншых еўрапейскіх баз дадзеных, якія змяшчаюць інфармацыю, напрыклад, пра візы.

ЧЫІЯ ДАДЗЕНЫЯ ЗАХОЎВАЮЦЦА Ў СІСТЭМЕ EURODAC?

Сістэма Eurodac змяшчае дадзеныя аб асобах, якія не з'яўляюцца грамадзянамі краіны ЕС+ і якія

- падалі заяву аб міжнароднай абароне;
- перасяклі мяжу краіны ЕС+ без дазволу;
- высадзіўся ў адну з краінаў ЕС+ пасля выратавання на моры.
- знаходзіцца ў нейкіх краінах ЕС+ незаконна;
- прыбылі ў краіну ЕС+ у рамках праграмы ЕС па перамяшчэнні або гуманітарнай дамове прыёму ці нацыянальнай праграмы перамяшчэння;
- атрымалі часовую абарону.

ХТО БАЧЫЦЬ МАЕ ДАДЗЕНЫЯ?

Нацыянальны орган па пытаннях прытулку краіны ЕС+ возьме вашыя біяметрычныя дадзеныя і перадасць іх разам з іншымі адпаведнымі дадзенымі ў сістэму Eurodac, дзе атрымае вынік параўнання.

Агенцтва Еўрапейскага саюза па супрацоўніцтву ў галіне праваахоўнай дзейнасці і нацыянальныя паліцэйскія органы могуць запытаць доступ да Eurodac для прадухілення, выяўлення і расследавання сур'ёзных злачынстваў і тэрарызму. Яны могуць здзейсняць пошук вашых дадзеных ў Eurodac.

ВАЖНА! Улады вашай краіны паходжання не будуць мець доступу да гэтай інфармацыі.

ШТО АДБУДЗЕЦЦА, КАЛІ Я АДМОЎЛЮСЬ ЗДАЦЬ АДБІТКІ ПАЛЬЦАЎ?

Вы абавязаны даць свае біяметрычныя дадзеныя, адпаведна заканадаўству.

Зняцце адбіткаў пальцаў мае важныя прычыны. Калі вы падалі заяву на атрыманне прытулку, гэта неабходны крок у працэдуры.

Дадзеныя адбіткаў пальцаў таксама могуць дапамагчы знайсці членаў сям'і ў краінах ЕС+.

Калі вашыя кончыкі пальцаў пашкоджаны, у будучыні вашыя адбіткі пальцаў будуць зняты зноў.

Калі кончыкі вашых пальцаў пашкоджаны наўмысна, гэта будзе мець адмоўныя наступствы.

Напрыклад, калі вы падалі заяву аб атрыманні прытулку, працэдура можа быць прыпыненая.

Калі вашая працэдура прыпыняецца, гэта азначае, што вы больш не лічыцеся заяўнікам (асобай, якая шукае прытулку). Вы страціце ўсе правы, звязаныя з гэтым статусам, як на дадзены час, так і ў будучыні.

Улады краін ЕС+ могуць выкарыстоўваць прымус як надзвычайную меру для атрымання вашых біяметрычных дадзеных. Яны таксама могуць затрымаць вас у якасці надзвычайнай меры для ідэнтыфікацыі або праверкі вашай асобы.

Калі вы адмовіцеся даць свае адбіткі пальцаў уладам гэтай краіны, гэта будзе мець пэўныя наступствы.

Вашая працэдура можа быць спынена.

ЯКІЯ Ў МЯНЕ ПРАВЫ АДНОСНА МАІХ ДАДЗЕНЫХ У СІСТЭМЕ EURODAC?

У кожнай краіне ЕС+ ёсць орган, які кантралюе выкарыстанне дадзеных. Вы маеце права звязацца з адказнай асобай і супрацоўнікам па абароне дадзеных і запытаць доступ да вашых дадзеных, якія захоўваюцца ў сістэме Eurodac.

Вы можаце запытаць выпраўленне сваіх дадзеных, калі лічыце яны

- недакладныя і патрабуюць выпраўлення;
- недастатковыя і патрабуюць абнаўлення.

Вы можаце запытаць выдаленне вашых дадзеных, калі вы выявіце, што яны

- незаконна ўвайшлі ў сістэму Eurodac.

Кантактная інфармацыя адказнай асобы і супрацоўніка па абароне дадзеных прыведзена на апошняй старонцы брашуры ў раздзеле **„Іншая карысная інфармацыя“**.

Калі вы жадаеце падаць афіцыйную скаргу на апрацоўку вашых дадзеных, вы можаце звярнуцца ў нацыянальны орган нагляду.

Кантактная інфармацыя нацыянальнага органа нагляду знаходзіцца на апошняй старонцы брашуры.

ІНШАЯ КАРЫСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

КАНТАКТНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ ЎСТАНОВЫ АДКАЗНАЙ ЗА АПРАЦОЎКУ ДАДЗЕНЫХ

Ніжэй вы знойдзеце інфармацыю пра тое, як звязацца з адказнай асобай і супрацоўнікам па абароне дадзеных у гэтай краіне.

Адказная асоба можа паведаміць вам пра вашыя асабістыя дадзеныя, якія захоўваюцца ў сістэме Eurodac. Калі вашыя асабістыя дадзеныя захоўваюцца няправільна, вы можаце запытаць аб іх выпраўленні.

Калі вы лічыце, што вашы дадзеныя былі апрацаваны незаконна, вы можаце адправіць запыт на іх выдаленне, выкарыстоўваючы кантактную інфармацыю, указаную ніжэй.

asylum.counsel@counsel.ee

ІНФАРМАЦЫЯ АБ ПРАВАХ СУБ'ЕКТА ДАДЗЕНЫХ

У гэтай краіне адносна выкарыстання ўласных асабістых дадзеных вы маеце наступныя пэўныя правы.

• Калі вы жадаеце атрымаць доступ да сваіх даных у Eurodac, вам неабходна адправіць запыт з лічбавым подпісам (e-ID) па адрасе

andmekaitse@politsei.ee

• Пасля атрымання вашай заявы мы паведамім вам, куды і калі вам трэба звярнуцца, каб зняць адбіткі пальцаў. Вашыя адбіткі пальцаў патрэбныя нам для пошуку вашых даных у сістэме Eurodac.

• Калі вы не можаце падпісаць заяву лічбавым подпісам, вы маеце магчымасць падпісаць заяву на месцы ўласнаручна.

• Пасля падачы запыту вы атрымаеце выпіску з вашых даных Eurodac.

КАНТАКТНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ОРГАНАЎ НАГЛЯДУ

Ніжэй знаходзіцца інфармацыя якой вы можаце скарыстацца, каб звязацца з нацыянальным органам нагляду ў гэтай краіне.

Калі вы лічыце, што якія-небудзь з вашых асабістых дадзеных былі апрацаваны незаконна, вы можаце падаць афіцыйную скаргу ў нацыянальны орган нагляду.

info@aki.ee

MAE HATATKI

Гэтая брашура прызначана выключна для інфармацыйных мэтаў. Яна не стварае ніякіх правоў або абавязкаў. Асноўная частка гэтага матэрыялу была прадастаўлена Агенцтвам Еўрапейскага саюза па пытаннях прытулку (EUAA), і EUAA дазваляе капіраванне і змяненне брашуры толькі дзяржавамі-членамі ЕС. EUAA не нясе адказнасці за дакладнасць, змест, паўнату, законнасць або надзейнасць інфармацыі, якая змяшчаецца ў гэтай брашуры, дзяржавамі-членамі ЕС або іншымі адказнымі трэцімі асобамі. Ні EUAA, ні любая асоба, якая дзейнічае ад імя EUAA, не нясе адказнасці за выкарыстанне інфармацыі, якая змяшчаецца ў гэтай брашуры.

© Агенцтва Еўрапейскага саюза па пытаннях прытулку (EUAA), 2025